Ба 44497

Л. С[illegible]РЫГАН



# ПРАВА НА ЭНТУЗІЯЗМ

БССР
Дзяржаўная бібліятэка
імені
ЛЕНІНА

Д В Б Л ö М

**КРАІНА**

ПАВІННА ВЕДАЦЬ СВАІХ

**ГЕРОЯУ**

31369

Б 44497
Ба 44497

ЯНКА СКРЫГАН

# ПРАВА НА ЭНТУЗІЯЗМ

Бел. аддзел 1934 г.
Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
ЛІМ

МЕНСК 1932

Рэдактар Л. Бэндэ
Тэхрэдактар І. Жыгар
Вокладка К. Касмачова
Здана ў друкарню 13-III—32 г.
Падпісана да друку 19/IV—32 г.

25. 04. 2009

Заказ № 608. 3000 экз. (2 арк.) Галоўлітбел № 146.

Друкарня імя Сталіна.

## I

Шырокім рыўком адчыніліся дзьверы і ў канторку зборачнага цэху нэрвова ўскочыў высокі, танклявы чалавек. Тым-жа самым нэрвовым рыўком ён зачыніў дзьверы, прыглушыўшы гуд матораў выпрабавальнае станцыі, што густа быў ўварваўся разам з чалавекам. Зачыніўшы дзьверы, чалавек на крышку суняўся і выцягнутаю галавою абвёў канторку. На худаватым яго твары вочы забегалі горача, рыўкамі, таксама як рыўкамі ўздрыгвалі губы, гарэлі шчокі, як увесь ён сам—высокі, наспрунжынены—быў рыўком.

Абвёўшы канторку, чалавек суняўся на рагавым століку і шырокаю буславатаю хадою найшоў на яго.

— Таварыш Санаторскі, вы ведаеце, што робіцца ў цэсе?—апускаючыся на крэсла, раптам агаломшыў чалавек начальніка цэху.

Санаторскі падняў галаву ад раскладзенага рысунку і на рысунак пальцы паклалі нажавую падкладку—ён зьвяраў падкладку з рысункам.

— А што такое, таварыш Белабжэцкі?

— А тое самае, што і ўчора, і заўчора, і тыдзень, і месяц таму назад. Прарыў!

Санаторскі глядзіць на Бэлабжэцкага, і яму неяк нязручна. Ён ящчэ нават добра не разумее Белабжэцкага. Ускочыў як на пажар, а гэта адчыняе Амэрыку.

— Вы гаварэце толкам, таварыш Белабжэцкі.

— Вось я толкам і гаварыў. Я пытаюся, ці ведаеце вы, як начальнік, што робіцца ў цэсе?

— Я-ж толькі што прышоў,—пробуе апраўдацца Санаторскі,—і наогул, вы-ж самі ведаеце, што я рэдка бываю...

— Вось пра гэта я і прышоў гаварыць. У цэсе прарыў. Не хапае дэталяй. З трыццацёх прысланых рам, дванаццаць адпраўлена назад. Бакавіны не прасьвідраваны. Шасьцёркі запораны. Краншгэйны з косымі пальцамі. А вы ведаеце, што гэтак і ўчора, і заўчора і штодня?

У Санаторскага чыста выбрыты, крыху даўгаваты твар і на твары пачынае тузацца

шчака. Шэрыя, крыху пудкія вочы падаюць на стол і пачынаюць нечага шукаць. Нажавая падкладка. Пальцы бяруць і адсоўваюць падкладку далей, а пасьля пальцам няма чаго рабіць і яны кіпцямі ўядаюцца адзін у адзін.

— Дык у чым рэч, таварыш Белабжэцкі? То тут-жа вінаваты мэханічны...

— Рэч у тым, што няма гаспадара,—Белабжэцкі налягае грудзямі на стол, шырока за край бяручыся рукамі, і ўпіраецца вачыма ў Санаторскага. Санаторскі падымае галаў, глядзіць на Белабжэцкага і ўпяршыню заўважае—да чаго ў Белабжэцкага мускулісты і энэргічны твар, да чаго цьвёрдыя яго сківіцы, і можа ад гэтага так цьвёрда і мулка напіраюць яго вострыя, круглыя вочы. Нават насупленыя бровы ня могуць пераняць гэтага распаленага бляску.

— Рэч у тым, што няма гаспадара... Так, вінаваты мэханічны. Але вы калі-небудзь былі ў мэханічным, каб дамовіцца, каб перасьцерагчы? Можа ў мэханічным няма рабочае сілы і нам трэба памагчы — перакінуць сваіх? А ў нас зрыў. У нас тузаніна, недахваткі, гарачка—і вы ня ведаеце, чым жыве цэх. Вы ня ведаеце як працуюць брыгады, чым яны жывуць і якавы

сёньня стан цэху. А вы павінны былі-б ведаць, і адказваць за гэта, як начальнік. Хто адказвае, што брыгады раскіданы, дэмаралізованы непаладкамі, пракурваюць дзень за варотаммі, што ў брыгадах растуць прагульнікі? Вось табельніца дала пілюлю: Зыскін ня прыходзіць на работу дваццаць дзён, Грыцькоў — дзесяць, Барэйша—дзесяць, Балдасенка—восем, Багданаў—сем. А колькі чалавек—па два, па тры? Гэта нармальна? У цэсе няма гаспадара, няма дысцыпліны, няма арганізованасьці—няма адказнасьці за яго. Вы нават ні разу не цікавіліся, не запыталіся ў мяне, што сёньня ў цэсе, як выканана заданьне, што перашкаджае. І я жыву нейкім самацёкам, бяз ніякага кіраўніцтва, бяз ніякага кантролю. Гэта нармальна? Гэта нармальна, што я пускаю Каганаву брыгаду дахаты, і вы нават ня ведаеце, чаму я яе пускаю.

У Санаторскага зноў ня ведаюць дзе дзецца пальцы. Яны нэрвова скубуць дошку стала, а пасьля падымаюцца і ўпіваюцца ў губу. Губа тузаецца, вырываецца, пальцы зноў ловяць яе, мнуць, жмакаюць і да таго ўядаюцца, што, здаецца, хочуць пракусіць яе.

— Так, гэта ненармальна... Але я не магу быць у цэсе, таварыш Белабжэцкі—фізычна не

магу. Загружаны. Ведаю сам, што ня добра, а—загружаны... Вось мае пасады: начальнік зборачнага цэху—раз, намесьнік загадчыка вытворчасьці — два, інжынэр па падрыхтоўцы новых машын—тры, інжынэр тэхнічнага аддзелу—чатыры. Цяпер вы бачыце, што мне цяжка ўсюды бываць, усюды ўсё ведаць.

Белабжэцкі выпушчае стол. Рукі зьбягаюцца, сьціскаюцца ў пальцах, і ён доўга думае. Адале ён гаворыць, і голасам такім, у якім перагарэла злосьць.

— Але ў цэсе трэба бываць хоць-бы ў вызначаныя гадзіны, каб я знаў—каб цэх знаў—што над ім ёсьць кіраўніцтва ды кантроль. Другое—я хачу, каб вы ў мяне пыталіся, каб цікавіліся, як ідзе выкананьне пляну—каб патрабавалі з мяне. Каб вы ведалі, як і чым жыве цэх—стварыўшы адказнасьць кожнага за сваю справу. І трэйцяе—я хачу ведаць пра свае абавязкі і права майстра цэху. Катора пара як я майстра, а я ня ведаю, чым я магу распараджацца, што ўваходзіць у межы маіх абавязкаў і якія мае адміністрацыйныя функцыі. Я хачу ведаць як, у якой ступені я магу распараджацца хоць-бы з тымі прагульнікамі, якія сёньня прыходзяць у цэх і бузяць. Вытвор-

часьць—гэта-ж машына, у якой павінна быць найвялікшая дакладнасьць і дысцыпліна. А я ня ведаю, што я маю права рабіць.

Санаторскі зноў скубе губу і гаворыць голасам ціхім, ужо спакойным, але такім, у якім была трывога. Вядома—гэта ня добра. Але інструкцыі дае ня ён, а заводакіраўніцтва. Ладна. Ён перадасьць. У заводакіраўніцтве яны недзе ляжаць надрукаваныя. Трэба дысцыпліна і дакладнасьць—пэўна. Але ён ня можа бываць у цэсе—фізычна ня можа, бо ў яго чатыры пасады, і ўсюды—хоць разарвіся. Што рабіць? Але добра: з сёньнешняга дня ён будзе на вытворчасьці заўсёды пару гадзін. Ад гадзіны да трох. Добра? Ну, вось. І навошта-ж крычаць, калі тут і так галава трашчыць. Мэханічны? Дэталі? Тузаніна ў брыгадах? Зрывы? Але-ж тут трэба рабіць нешта такое, што павінна перайначыць усю сыстэму. Вось у яго нажавая падкладка. Яна няправільная. На цэлых чатыры міліметры таўсьцейшая пятка. Ідзе ад канструкцыі, ад мадэлі. І тут непаладкі не ад цэхавае ўстойлівасьці, а недзе глыбей—у самой арганізацыі вытворчасьці...

Санаторскі супакойвае Белабжэцкага, прабуе яшчэ пра нешта гаварыць, растлумачыць, але

Белабжэцкі ўжо ня слухае Санаторскага. Нехта ўвайшоў у канторку і па голасе матораў выпрабавальнае станцыі, што ўварваліся праз адчыненыя дзьверы разам з чалавекам—Белабжэцкі пазнае, што цэнтрабежная сіла матораў зьменшана, што паток парваны, што паток не падае машын.

Заела. Гэта яшчэ ўчарашняя адрыжка. Запораныя бакавіны. Даводзіцца падрэзваць дзіркі—класьці дубальтовы час. Падгонка тармозіць, паток разрываецца, выпрабавальная станцыя ня мае машын і маторы пачынаюць сьціхаць.

Санаторскі яшчэ ўсё нешта гаворыць, але Белабжэцкі ўжо ўстаў і ідзе ў цэх. Яго буславатая хада напірыстая, і ззаду на шыі, на кожным кроку напінаюцца дзьве жылы.

Зборачны цэх цягнецца доўгаю шырокаю заляю. Ён канчаецца тут каля канторкі, упіраючыся ў выпрабавальную станцыю, а пачатак ідзе з далёкага канца — ад мэханічнага, ад першае брыгады ўстаноўкі і шаброўкі падшыпнікаў. Паток зборкі сіласарэзак цягнецца праз увесь цэх, падаючыся пад выпрабавальную станцыю, Але паток застраў у другой брыгадзе. Брыгада недаатрымала дэталяй. Брыгада

атрымала дэталі няправільныя і цяпер засела на падгонцы.

Мінаючы варштаты, абыходзячы няскончаныя машыны — прагалінамі, парваным патокам — Белабжэцкі ідзе ў другую брыгаду. Брыгадзір Лейкін, нагнуўшыся над рамаю, сам аглядае брак—штангелем вымервае ступень недакладнасьці. Дзіркі з боку. Бакавіны не прыпадаюць. І ўсё-ж такі лепшых няма, ня выкінеш—трэба падпілоўваць.

— Падпілоўваць!—гаворыць ён да рабочага.

Напільнік зашоргаў і Лейкін ужо ідзе на другі працэс—там таксама не прыпадаюць грабёнкі. На хаду яго наганяе Белабжэцкі. На моцны ўдар па плячы Лейкін азіраецца.

— Ну, што?

— А вось бачыш, кешкаемся. Сёньня нейкі вар'яцкі дзень. Забіраеш з-пад рук у мэханічнага, і ўсёроўна—няма. А не—спрэс брак. Вось, бач, селі,—і Лейкін паказвае на брыгаду, на няроўны шар патоку, на тузаніну заедзеных працэсаў.

— Трэба падагнаць, —кажа Белабжэцкі,— трэба выпрастаць лінію—стачыць паток! Дзе Каган?

Ён шукае вачыма Кагана, там дзе павінна быць яго брыгада, але паток каганавае брыгады пусты, застыў і людзі, скарыстоўваючы прастой, вышлі курыць.

— А вунь далі партыю тоўстых вальцаў, трэба ператочваць,—кажа Лейкін, і ідзе на працэс, дзе рабочы марудзіць, падбіраючы шасьцёркі.

Каган паказваецца на канцы цэху, каля выпрабавальнае станцыі. Белабжэцкі кліча яго махам рукі, і гэтую-ж руку перабівае рабочы.

— Таварыш Белабжэцкі, няма балтоў.—На зашмальцованай ладоні ён трымае болт і паказвае.—Далі вось якіх, а яны зусім кароткія. Дзе ўзяць балтоў?

— Найдзеце, з старых, з браку—хоць крыху. Пратрымайцеся пакуль дамо. Балты зараз будуць... Таварыш Каган,—ён ужо гаворыць да чалавека з тонкім энэргічным тварам—да брыгадзіра апошняе брыгады на патоку зборкі сіласарэзак.

— Таварыш Каган, брыгаду пакінуць. Пяцёх чалавек давай Лейкіну на падгонку дэталяй. Трох стаў на ручныя плашкі—нарэзваць балты. Трох у мэханічны—няхай буксуюць, няхай падцягваюць, няхай, калі трэба, точаць самі!

Рэшту—на свой працэс. Стачыць паток! Выцягнуць хоць тое, што можна!

— З канторкі выходзіць Санаторскі. Выбрыты доўгі твар яго ў цэсе здаецца блядым, і на хаду ён нешта гаворыць памочніку майстра Сімховічу. Сімховіч паціскае, відаць не разумее, ці не згаджаецца, а пасьля махае рукою і ідзе на паток. У цэсе перабіўчаты стук, звон, шоргат, скрыгат жалеза. Людзі, прыгнуўшыся, пільна стаяць на сваіх працэсах. На патоку стаіць Белабжэцкі і яшчэ нешта думае. Ён правярае—ці добра аддаў загад, ці правільна расставіў сілу. Думку перабівае Сімховіч. Сімховічу ён перадае загад, а сам—буксаваць, падцягваць—порстка ідзе ў мэханічны.

## II

Яго можна ўявіць у рабочым зашмальцованым гарнітуры, у шкураной тужурцы, у плашчы ці ў палітоне,—але заўсёды гэта будзе высокі танклявы чалавек з мускулістым тварам, з цьвёрдымі скіўцамі і, можа ад гэтага, з цьвёрдымі, напірыстымі вачыма. І ён заўсёды будзе ў цэсе, у людзях, на патоку зборкі сіласарэзак, паяўляючыся то тут, то

там, пільна прыслухоўваючыся да пульсу патоку: вачыма, слыхам, чуцьцём правяраючы цэх.

На зборцы пульс залежыць ад мэханічнага. Мэханічны часта зрывае дэталі, і трэба пільна сачыць, каб змагчы папярэдзіць, уладзіць непаладкі, стачыць канцы, знайсьці выйсьце. І гэты чалавек заўсёды ў русе, заўседы ў цэсе, на заводзе—заўсёды ў рабоце, у дэталях, у думах—у бегатні. То ён перш відзён каля выпрабавальнае станцыі, поркаючыся, правяраючы закончаную машыну, то раптам ён ужо ў мэханічным спрачаецца з начальнікам цэху з Дрыцам, бо трэба прысьпешыць абробку дэталяй. І—зноў ужо на зборцы, у людзях, у патоку, на працэсах работы, з рабочымі. Вось ён прыгнуўся над рамаю, бо рабочы паклікаў праверыць дакладнасьць прыпушчаных дэталяй. Вось ён выпрастаўся і ідзе пад варштат, дзе Яфімаў зьбірае крапштэйны. Краштэйны з дэфэктамі—ці ня кораткі будуць пальцы? У яго ўжо ў руках штангель, і галава нагінаецца праверыць мілімэтры... Падыходзяць другія або клічуць махам рукі—у іх, на іхным працэсе таксама затрымка або недакладнасьць.



БА 44497

Патрэбна сыстэма. Патрэбна дакладная сыс-тэма, такая, каб цэх быў з нармальным пульсам, каб паток зборкі машын ішоў бесь-перабойна, матэматычна дакладна—гатовымі машынамі да выпрабавальнае станцыі. Але завод · яшчэ новы. На заводзе багата непа-ладкаў, зрываў, неўсталяванасьці У гарачцы пуску заводу дапусьцілі багата недаклад-насьцяй у рысунках, у канструкцыях, у дэта-лях. І цяпер, калі завод пачаў расьці—му-ляцца пачалі шурпатасьці штодзённымі пера-боямі, зрывамі, недавыкананьнем заданьня. А зборка павінна ісьці патокам бесьперабойнае падачы машын пад выпрабавальную станцыю

Але дзень заўсёды трывожны. На зборцы, на патоку прарывы. Графік выкананьня за-даньня нэрвова хістаецца, тузаецца ломанаю лініяю, як тузаецца ўвесь цэх. Непаладкі. Мэханічны даў бракоўныя дэталі... Ліцейны падачу дэталяй затармазіў... Лёгка-кацельны не зрабіў патрубкаў... Кавальскі ня даў восей шайб... У брыгадах на зборцы тузаніна. У брыгадах парушана сыстэма патоку—заела! Графік выкананьня хістаецца—падае ўніз.

І Белабжэцкі зноў у цэсе, між людзей, між патоку—аддаючы апэрацыйную каманду.

Але-ж гэта ня ўсё—думае Белабжэцкі, калі паток зноў наладжваецца,—гэта ня ўсё і не заўсёды — жыць сілаю пераключкі.—Дэталі заядаюць штодня, штогадзіны. Графік выкананьня бярэцца нэрвамі. Вінаваты мэханічны? Так, але вінавата і сыстэма апэрацыйнага кіраўніцтва ўсяго заводу. Прывычная старасьвецкая павольнасьць і наплюйства. Мы гаворым, што зборка можа ня толькі выканаць, але і перавыканаць прамфінплян—і ўсё-ж такі: дзённыя заданьні замест трыццацёх сіласарэзак васемнаццаць-дваццаць. Значыць, ёсьць няўвязкі. Хіба нармальна, што брыгада зборкі дыскаў—сорак чалавек—не дае больш дзевятнаццацёх дыскаў за зьмену? Значыць ёсьць лішнія людзі. Значыць, прападаюць рабочыя гадзіны. Мы крычымо, што зборка ўся ў парадку, а хіба гэта ня гультайства? А лодыры і прагульнікі? А тое, што багата яшчэ хто любіць увесь дзень пракурыць за варотамі і, як правіла, стаць на работу толькі згадзіўшы чвэртку гадзіны пасьля гудка? Сіла стаіць не рацыянальна. Сіла без дысцыпліны, без дакладнасьці заводзкага мэханізму. Гэта хворая сыстэма, гэта адсутнічае апэрацыйнае кіраўніцтва, дысцыпліна, каманда. Трэба новыя

мэтады, трэба індывідуальная адказнасьць кожнага за свой працэс, за норму...

У думах, у напружанай рабоце мысьлі Белабжэцкі ідзе да Санаторскага—каб начальнік падаў каманду—але столік начальніка цэху пусты.

## III

Але ўсё-такі трэба зрабіць. І трэба пачаць менавіта са зборкі з свайго цэху—удакладніць, падчысьціць, паставіць на месца людзей. Трэба па новаму расставіць рабочую сілу—падвысіць пэрсанальную адказнасьць кожнага. Зборку трэба зрабіць здаровай.

І Белабжэцкі на двары, каля кавальскага наганяе Сімховіча. Сімховіч адразу нешта хоча сказаць Белабжэцкаму, але Белабжэцкі перабівае яго.

— На ячэйцы гаварылі?

— Гаварылі. Трэба абавязкова зрабіць.

— Дык, давай, мы гэта сёньня і зробім.

— Давай.

— Ладна. Тады ты смалі ў цэх, а я да Генкіна. Пагавару з ім. Скажы ўсім хлопцам, што зразу пасьля работы. Каб не разыходзі-

лісь. Шырокаму скажы, каб затрымаў усю брыгаду... А ім дамо Лейкіна. Хлопец—во!—выцягне. Смалі.

Вострымі высокімі плячыма, Белабжэцкі зьнікае за заводзкаю брамаю, а Сімховіч яшчэ доўга стаіць сярод двара, варочаючы ў руках штангель. І толькі тады, калі штангель зьнячэўку ўшчыквае палец—адумляецца і ідзе ўцэх. У цэсе ён перадае нешта брыгадзірам рабочых і, не адрываючыся ад сваіх працэсаў, кіўком галавы яны даюць знаць, што зразумелі, пачулі. Доўга талкуе Сімховіч з Шырокім. Тузаючы ў руках молат, Шырокі спрачаецца, але молат пасьля супакойваецца, упіраецца ў дыску, і Сімховіч адыходзіць, зноў варочаючы ў руках штангель.

Цэхавая сырэна прагула, канец рабочага дня. Цэх сьціхае грукатам і ажывае чалавечым рухам. Хаваючы струмант, праходамі, прагалінамі, застыўшым патокам машын—рабочыя сыходзяцца ў дыскавы куток цэху, Брыгада Шырокага абраствае гулкім натоўпам. Рабочыя гарнітуры робяць людзей шырокімі і блішчаць зашмальцованымі крысамі.

— А ты стой, не ўцякай, пасьпееш,—цягне за

руку малады зборачнік грузнага шырокаўца, што мерыцца высьці з цэху.

— Хлопцы, стой! Сур'ёзная рэч, а вы, як мышы!—крычыць нехта з натоўпу і яго рука паказваецца над галовамі.—Таварыш Шырокі, брыгада ўся?

— Уся.

— Пачынаем!

Да варштату каля сьцяны—сьпінаю прыпіраецца Белабжэцкі. Галава падаецца наперад. Ш ураная шапка блішчыць, зачыняючы казырком твар. Ад матавага бляску запыленых вокан цьвёрдаю сківаюцца вытыркае шчака і слабымі контурамі вырысоўваецца край адтатурчаных губ.

— Гаворка будзе кароткая, у нас—прарыў. Заданьне—дваццаць пяць сіласарэзак. Мы далі сустрэчнае трыццаць, а ня выконваем і дваццацёх. У чым прычына? У нас! Вінаваты мэханічны? Падцягнем—трэба падцягнуць мэханічны, і гэта трэба зрабіць нам. Але гэта пасьля. Цяпер пра зборку. У нас усё ў парадку? У нас—прарыў. І асобныя брыгады, і асобныя рабочыя за завод—не хварэюць.

Белабжэцкі на трошку спыняецца і па казырку шапкі, па цені на сківаюцы відно, што ён

аглядае — мацае - натаўп. Зашмальцованыя гарнітуры, шчыльней зьбіўшыся наперадзе, назадзе паўрымшчваліся на варштатах, сядзяць на зложаных дысках, на дэталях машын. Калі цені на шчацэ застылі—зноў пачуўся галас:

— Узяць брыгаду Шырокага. Зборка дыскаў. Сорак чалавек у брыгадзе і даюць толькі дзевятнаццаць дыскаў за зьмену, тады калі нам трэба трыццаць. Два чалавекі на дыску. Гэта нармальна? Вы кажаце лопаецца—крохкі чыгун. Багата браку. Але брак-жа робім мы? Я сёньня спэцыяльна зрабіў пробу. Дыск нармальнае цьвёрдасьці, і брак гэта—наш. Але будзем гаварыць пра брыгаду. Сорак чалавек і дзевятнаццаць дыскаў. Дзе-ж прападае рабочы час? Яго зьядае наплюйства, безадказнасьць, абязьлічка, падзёншчына. Цэх пераходзіць на гаспадарчы разрахунак. Цэх пераходзіць на зьдзельшчыну. А мы жывем тэмпамі чарапахі. Доўга гаварыць ня трэба. Брыгаду трэба паставіць па-новаму.

Белабжэцкі зноў перадыхнуў. На шчацэ заторгаўся мускул. На перадзе гурт парадзеў—расьсеўся па цэсе на дысках.

— Зрабіць так: брыгаду Шырокага скараціць на палову. Падвысіць пэрсанальную адказнасьць

кожнага за свой працэс. Падняць дысцыпліну. Дакладна давесьці да варштату нормы. Кожнага прымацаваць на сваю дэталь. Зьнішчыць абязьлічку.

— Гэта ня возьме!

— Ня выпаліць!

— Вышэй пупа не падскочыш!—паднімаецца з дыскі даўгалыгі шырокавец і глыбока засоўвае руку і кішэню шырокіх нагавіц.

— А як-жа?

— Ды так, як ёсьць. З прарыву людзей ня здымаюць, а даюць на прарыў! Але-е.

Гелабжэцкі адыходзіць ад варштату. Цьмяны бляск сьлізгае па патыліцы шкураное шапкі. Перабіўчатымі галасамі шырокаўцы заяўляюць пратэст. Старшыня цэхкамітэту грукае жалезінаю па варштаце.

— Парадак!..

— Што парадак?—зноў падымаецца з дыскі карчукаваты, віхрасты рабочы.—Гэта ня возьме! Ня можам нормы—значыць бяз сілы. Што мы гуляем? Не машыны мы, каб рабіць бяз меры, а робім мы тое, што можам.

— На вуліцу выкінуць хочаш? Памалу. Ды гэта і ня страшна. Работы ўсюды—уга.

— Такога прагоняць.

... Сход шуміць перабойнымі галасамі. Гарнітуры шавеляцца, шавеліцца цэх. Шырокаўцам ня хочацца распускаць брыгады, каб страціць дарагую павольнасьць. Старшыня цэхкамітэту кліча да парадку і ён ужо трымае прамову. На дысках гнілая атмасфэра. Хіба ня з іхнае брыгады на днях цэхкамітэт абгаварваў прагульнікаў? Хіба ня з дыскаў вечна сядзяць ля варот пракурваюць гадзіны, пакідаючы горы недакуркаў? Прывыклі рабіць з халадком.

— Трэба новыя формы, новыя мэтады,— канчае старшыня і натаўп зноў гудзе.

Але на шырокаўцаў напор здаровы. Цэх, зборка—рабочыя іншых брыгад зборкі—шырокаўцаў вінавацяць у прарыве. І яны гавораць так, як-бы знаюць брыгаду навылет.

— Лодыраў багата ў вас—во!

— Адзін аднаго прыкрываеце!

Белабжэцкі сядзіць на раме ходу, казырок шкураное яго шапкі нагнуты ўніз і па ім відно, што Белабжэцкі глядзіць у зямлю. Прэнцікам ён варочае па падлозе нажавую падкладку. Такая-ж самая, як была ў Санаторскага на стале. На чатыры міліметры ў яе вышэйшая пятка. А брыгада кляпала, стаўляла няправільна

нажы—і ёй хоць-бы што. А пасьля дэфэкт у гатовай машыне—на выпрабавальнай станцыі. ..яправільная зборка праходзіць праз увесь паток, каб пасьля даць тормаз. А яны крычаць за сваю чэснасьць...

— Ды ня можна-ж рабіць так!—недзе з кутка, з-пад вакна гудзе здаравенны голас,—Прарыў, а вы заліваеце кулі. Дыскі... А дыскі то што, нам падаюць з неба? На зубы трэба браць мэханічны, а мы—скароціце—не дамо і таго, гэта ясна. І сёньня гаварыць пра скарачэньне брыгады, значыць рабіць шкодніцтва.

— Ого!

— Рапартуй, рапартуй!...

Шырокаўцы не здаюцца.

Выступае сакратар парт'ячэйкі, Сімховіч, Лейкін, камсамольцы выпрабавальнае станцыі, Пракаповіч, Купрыянчык, брыгадзіры брыгад, рабочыя—цэх: сілаю, воляю, рабочаю праўдаю—правам на масавы пралетарскі кантроль, правам на сацыялістычную будоўлю, адкуль і родзіцца энтузіязм. Ясна ўсім: на дысках балота, на дысках прарыў—і прарыў трэба зьнішчыць.

Масавая воля разьбівае шырокаўцаў. Так, у іх ёсьць гніль і пра гэтую гніль гаворыць

ужо сам шырокавец. Гаворыць праўдаю рабочага болю за норму, болем змаганьня за графік.

— Так, у нас блытаніна,—у матавым бляску шчокі гараць,—ёсьць блытаніна, і трэба разблытаць. Два чалавека на дыску—грэх. Гэта горш чарапахі.

— Ёсьць у нас грашкі—верна.

Масавая воля разьбівае шырокаўцаў і ў разьбітае палавіны наростае большая злосьць. Здаравенны голас з кутка расьце сілаю, яго падтрымліваюць другія, і тады чалавек, аддзяліўшыся ад сьцяны, апускае кулак па струментальнай шафцы.

— Гэтага так ня будзе! Разгром! Гэта не падаруецца!

І да варштату, дзе прыпёршыся стаяў Белабжэцкі, выходзіць складзістая фігура. Фігура невялікая, але складзістая, і ў хадзе нават нейкая грузнасьць. „Галоўны інжэнэр“ — гаворыць нехта з натаўпу. А „галоўны інжынэр“—сакратар партыйнага калектыву, Генкін, і ня інжынэр ён, а бывалешні токар мэталіст, які любіць завод, жыве яго пульсам, знае навылет. Ён вечна ў заводзе, у рабочых масах, у нарадах; рабочыя яго ведаюць як бацьку заводу, самага

блізкага кіраўніка, і за гэта завуць „галоўным інжынэрам". Але цяпер ніхто не заўважыў быў Генкіна. Можа, ён тут вось стаяў і слухаў і ніхто яго ня бачыў у гарачцы.

Не дайшоўшы да варштату, Генкін стаў, павярнуўся, і ў кучаравую галаву па прывычцы на трошку ткнулася рука. Грузнаю складзістаю фігураю ён стаіць неяк шырока.

— Што-ж, будам гуляць у жмуркі? Можа, возьмам яшчэ мячык ды будам качаць па цэсе? Куды ты хаваеш нож? Ты нож пакажы ўсім!— Генкін галавою глядзіць пад струмантальную шафку. Здаравенная фігура няспрытна неяк згі…ецца, як-бы корчыцца, мнучы падол рабочае кашулі.—Вось бачыце. А вы гаварыце, што ўсё добра. За тое, што на дысках гніль, што на дысках прарыў і ў рабоце, і ў людзях— гаворыць сёньнешні сам сход. Я ня чуў ніводнаг камуніста з гэтае брыгады, які-б выступіў і чэсна прызнаўся. А прызнавацца ёсьць у чым, багага.

І, зноў запускаючы руку ў чупрыну, Генкін гаворыць фактамі. Фактамі чалавека, які бачыць брыгаду, цэх завод—навылет. З фактаў нікуды ня выскачыш. Брыгада няжывая, не-

паваротлівая—як на паншчыне. Няма зацікаўленасьці ў рабоце—болю за цэх, за норму. Дзе прапановы па рацыяналізацыі, зьніжэньне сабекошту, ударніцтва, спаборніцтва! Брыгада загнілася і яе трэба аздаравіць. Падкулачнікаў, кулакоў з нажамі—вытруціць. Бой прагулам, гультайству, неахайнасьці абвясьціць новымі формамі работы. Прапановы Белабжэцкага ажыцьцявіць—праветрыць гнілое месца. Гэтага патрабуе ўвесь цэх.

Шырокаўцам ня добра сябе адчуваць разьбітымі. Так, гэтага патрабуе ўвесь цэх, і вось ён сышоўся, каб сваёю сілаю наступіць шырокаўцам на горла. Вунь нехта гаворыць зноў, але ў руках ён ужо трымае ліст і чытае. Трыкутнік выпрацаваў мерапрыемствы:

— брыгаду скараціць – пакінуць дваццаць два чалавекі...

— прымацаваць да працэсаў, зрабіць новыя расцэнкі...

— падняць дысцыпліну, ускласьці пэрсанальную адказнасьць...

— лепшых работнікаў даць мэханічнаму цэху...

— выклікаць на спаборніцтва, брыгаду ўзяць на буксір...

— зьняць Шырокага—брыгадзірам паставіць Лейкіна...

І—зноў нехта чытае і ўжо новы ліст—умова сацыялістычнага спаборніцтва.

Праз шырокія вокны запыленых квадраткаў шыб па цэсе плавае матавы бляск. У матавым бляску, на патоку зборкі дыскаў, людзі ажывіліся. Ліст падымаецца над галовамі, чуцен нечы голас „хто за“ і ўгору пачынаюць падымацца чорныя ад пылу і жалеза рукі. Блясткам між рук, пераходзячы ў натаўпе, адсьвечвае шкураная шапка. Шапка сунімаецца, у натаўпе зноў перабоямі ажываюць галасы, але ўжо такія, як па камандзе „вольна“. З гэтымі-ж галасамі разыходзіцца натаўп, і ўжо ў баку Белабжэцкі прыгінаецца, каб у бакавую кішэньку пакласьці пажмаканыя лісты паперы. Нехта з разгону шарахае яго ў бок, порстка прабягаючы міма. Шырокімі, ненатуральна зробленымі плячыма ён ужо мігнуў у цэхавых варатах і, гледзячы ўсьлед, Белабжэцкі прыпамінае: грузны граміла, якога за руку цягне на сход малады зборачнік; здаравенны голас з кутка на спрэчках; нож, і нехта няспрытна, мнучы, абцягвае падол рабочае кашулі...

* * *

Зборачны цэх адпачывае застыўшым патокам. Праз квадраткі шыб муцьцю на паток наплывае вечар. На далёкім канцы цэху—адпужваюць вечар агні начное зьмены мэханічнага.

Мэханічны заліты электрычным бляскам. У бляску палошчуцца трансмісіі, працуюць варштаты, камандзірамі каля варштатаў варушацца людзі і цэх—у прыгожай сіле матэматычна дакладнага руху.

Белабжэцкі стаіць з майстрам начное зьмены мэханічнага. Яму няма калі ісьці да хаты разам са зборкаю. Трэба астацца тут, каб бачыць самому, ці добра ў мэханічным разьмяркованы дэталі, ці зроблены будуць дэталі на заўтра—умяшацца ў мэханічны патрэбамі зборкі. Танкляваю фігураю ён шворыць між варштатаў, мацае, правярае яшчэ цёплыя дэталі—толькі-б, чэрці, не давалі браку, і—нешта надумаўшы—праз увесь цэх, патокам застыўшае цьмянае зборкі—ідзе на другі далёкі канец. Каля канторкі з ручнымі электралямпамі, таксама ваюць яшчэ за норму пару энтузіястаў камсамольцаў выпрабавальнае станцыі. Ім трэба кончыць яшчэ одэтую апошнюю машыну. Недзе

ў перадачы дае перабой. І яны асталіся пасьля брыгады, каб паправіць машыну,—хоць-бы на процант выпрастаць графік.

Белабжэцкі кладзе Куприянчыку на плячо руку.

— Ня злуешся?

Купрыянчык глядзіць на Белабжэцкага маладым, круглявым замурзаным тварам. Зьнізу на твар адсьвечвае электрычная ручная лямпа, і ў гэтым косым сьвятле цяпліцца ўсьмешка.

— Кінь, што ты.

— А чорт яго, браце,—гаворыць Белабжэцкі, таксама хаваючы недзе ў сабе такую-ж усьмешку, і скубучы каля вуха рукою,—з гарача я гэта накрычаў. Сам знаеш—натузаешся так от за дзень, нанэрвуешся—ну і перагнеш бывае. Так і з табою...

— Кінь, што я ня знаю?

Белабжэцкі яшчэ раз кладзе Купрыянчыку руку на плячо, сьціскае, і ў гэтай руцэ Купрыянчык чуе добрую, харошую цяплынь начальніка. Купрыянчык глядзіць яму ўсьлед, а Белабжэцкі ўжо адчыняе дзьверы канторкі і там—за столікам, за распрацоўкаю заўтрашняга заданьня—яшчэ застае Сімховіча.

— Накрычаў быў удзень на хлопцаў за затор машын, а сам вінаваты... Ну, што ў

цябе?—ужо пытаецца ён, гледзячы на разьметкі, і цяжка апускаецца на крэсла.

За вокнамі ноч. Недзе з канца цэху, глуха па сьценах чуцён гуд мэханічнага, па канторцы расплываецца бляск адзінотнае лямпкі і Сімховіч неяк грузна падымае цяжкую галаву.

— На заўтра ня будзе ўсіх рам. Ня ў час падалі і Саранчук ня змог зашабраваць. Трэба другую брыгаду паставіць на гадзіну пазьней.

— Так. Давай-тка дамо мэханічнаму дакладную нарадку на ўсе дэталі. Дамо пад нос, усё як на далоні, і няхай папробуюць сказаць, што яны ня ведаюць, чаго ў нас няма.

Сьцены гудуць далёкім гудам мэханічнага. За вокнамі ноч. Над столікам нагінаюцца, вылічваюць на паперы заўтрашні дзень дзьве фігуры. Заўтрашні дзень трэба вымацаць шчыльна. Вымацаць лічбамі, дэталямі, працэсамі, патокам—графікам заданьня. Увесь завод трэба бачыць вось так, на далоні. Мэханічны падгадзіць, сарве і ён будзе паказваць прычыны. Няўдалыя разцы, парваліся пасы, заела сьвідроўка, няма самакалу, стаялі варштаты... Мэханічны знойдзе тысячы аб'ектыўных прычын. Трэба вылічыць заўтрашні ўзень, хоць цяжка, хоць вылічэньне будзе варажбою.

За шырокімі вокнамі ноч. Глуха па сьценях чуцён далёкі гуд мэханічнага. Дзьве фігуры ў канторцы нагнуты над столікам, і коса па канторцы кладуцца іхныя цені. Ноч сьпіць. Цені згінаюцца, іх варушыць дрымотная цяжкая ўтома.

Пасьля цені ўстаюць. Рука датыкаецца да выключальніка—у канторцы тухне сьвятло.

Каля цэхавых варот фігуры разьвітваюцца. Высокая варочаецца назад, і ўжо шкураною шапкаю відна ў мэханічным. Трэба яшчэ раз паглядзець на праекцыю заўтрашняга дня. Трэба майстру перадаць нарадку, пахадзіць каля варштатаў, памацаць, праверыць дэталі, а тады—можна пайсьці.

... На вуліцы Вароўскага сонная ціш. Вуліца сьпіць прыгараднаю муравою, застыўшым на платох вішняком, выдыхаючы ў ноч лёгкі сагрэты пах зеляніны. Па мураве ногі ступаюць мякка. І ўдыхаючы гэту мяккасьць і ціш— па целе разьліваецца прыемная лёгкасьць. Белабжэцкі шукае нечага ў памяці, і здагадваецца: гэта грузам зваліўся сёнешні дзень.

— Куды гарачэй як на 401 вярсьце,—шэпча ў думках Белабжэцкі, і цёплаю ўсмешкаю перабірае ўспаміны.

## IV

401 вярста асталася ў памяці Белабжэцкага рэвалюцыяй.

1917 год. Зямля ў агні. Людзі ў тузаніне у сумяціцы, у нэрвах, у рэвалюцыі. Дзьве рэвалюцыі. Людзі, франты, кулямёты, атрады страляніна. І недзе напіраюць немцы. І недзе зьбіраюцца банды. І загад—адступаць.

401 вярсьце трэба тэрмінова эвакуявацца. Разгружаюцца ваенна-інтэнданцкія склады. Снуюць хворымі трыбухамі паравозы. Бегаюць людзі з кацялкамі, з бомбамі, з вінтоўкамі з мацюгамі, з песьнямі, з недаедзенымі скарынкамі хлеба. І Белабжэцкі ў людзях, у нэрвах, у сьпешцы, у тэрміновай эвакуацыі. Трэба хутчэй разгружваць склады—быць: грузчыкам, пакатнікам, стрэлачнікам — вагоны, вагоны— адпраўляць вагоны!

Гэты кавалак — 401 вярста — у нэрвах, у бяссоніцы, у мацюгні, у тлуме, у тузаніне— у памяці.

Пасьля: Смальяны, Нарабраз, Брыгневіч, Валвыканком, камісіі, камітэты, хлебанарыхтоўкі, царкоўныя каштоўнасьці, банды, кулакі. Трэба быць асьцярожным. Трэба зноў быць на

нэрвах, на сходах, на мітынгах, трэба... трэба даставіць краіне хлеб! Гразкія, доўгія, лясістыя дарогі па сёлах. Напружана, пільна трэба трымацца на мітынгах. А пасьля—трэба ведаць дарогі, трэба ведаць, дзе спаць, і сьціскаць ўвесь час у руках наган. За хлеб сурова разьлічваюцца кулацкія банды...

Гэты зноў кавалак—у нэрвах, у напружанасьці, у штурме—у памяці.

Пасьля вінтоўку Белабжэцкі здаў, пайшоў на вучобу. Скончыўшы Магілёўскі індустрыяльны тэхнікум,—ён да 1928 году тэхнік-практыкант Аршанскага заводу „Чырвоны Кастрычнік“. У дваццаць-жа восьмым годзе камандыруецца на Гомсельмаш.

Сельмаш яшчэ толькі будуецца. Стаяць рыштаваньні, узводзяцца карпусы, але трэба рабіць падрыхтоўку. Трэба рабіць рысункі, праекты, канструкцыі, мадэлі, а каб пасьля работаю пусьціць завод.

У кутку пабудаванага корпусу—маленькі цэх. Адсюль павінен радзіцца Сельмаш. У цэсе пятнаццаць чалавек рабочых, такароў, сьлесароў, мэханікаў, інжынэраў, практыкантаў—разам. У цэсе стаіць пару варштатаў, пахне земляны

дол, людзі ходзяць па дошках—робяць мадэлі, узоры, дэталі будучых машын.

У студзені 1930 году—пробныя машыны гатовы. На заводзе ўжо чалавек трыста рабочых. Але машыны ідуць туга. Машыны новыя, новая справа—багата недаглядаў, затрымак, недакладнасьцяй. А галоўнае—няма практыкі, няма ўмельства. Людзі робяць, перарабляюць, зноў робяць і ўрэшце—тры-чатыры машыны за дзень.

Сьмешныя тэмпы. Трэба добрага камандзіра, добрага кіраўніка, работніка, каб умеў наладзіць і людзей, і машыны, і работу. З канструктарскага аддзелу Белабжэцкі мабілізуецца ў цэх на прырыў, на зборку сячкарань. Ня хоча, а ўсё-ж такі трэба.

У Белабжэцкага вялікая ўпартасьць. У Белабжэцкага вялікая воля і кемкасьць. Галоўнае—правільна расставіць рабочую сілу. Правільна, стройна паставіць паток. Але паток зрываецца, машыны ня ідуць—заядае. Блытаніна ў дэталях. Значыць вінаваты рысункі. Значыць, трэба на хаду папраўляць памылкі.

І сельмашаўцы памылкі папраўляюць на хаду. Ен начамі сядзіць у цэсе: слухае, прыглядаецца да сячкарань: варочае, вымервае дэталі і

лічбы запісвае ў кніжку. Але папраўленая дэталь сыстэмы ня лепшыць, і—зноў трэба начамі сядзець, вымерваць, вывучаць, каб папраавіць сыстэму. І галоўнае—трэба ўмеючы людзям падаць каманду...

Каманда дадзена добра.

Зборка сячкарань пайшла патокам.

Белабжэцкі мабілізуецца зноў на прарыў—на сіласарэзкі. Ён прызначаецца памочнікам майстра ўсяго зборачнага цэху.

На сіласарэзках справа куды горш. Машына зусім новая. Канструкцыя няправільная. Дэталі паблытаныя. І тады-ж Белабжэцкі ідзе да сакратара партыйнае ячэйкі—да Сімховіча.

— Трэба пачынаць з самага пачатку—трэба нанава канструяваць,—гаворыць Сімховіч.

Але майстра цэху, Гейхман, пярэчыць. Нанава канструяваць—значыць спыніць зборку. Гэтага нельга зрабіць, дый наогул—чаго ён лезе не ў сваю справу, калі майстра ня ён, а—Гейхман. Мы выпускаем дванаццаць машын і хопіць.

Але Сімховіч з Белабжэцкім ідуць у заводакіраўніцтва, Гэтых машын пускаць нельга. Няма стандарту. Дэталі з аднае машыны ня прыпадаюць да другое. Няма як даваць запас-

ных частак. Трэба зрабіць новую канструкцыю машыны.

Загадчык вытворчасьці, Фэльдман, ня хоча. Заводакіраўніцтва дазволу не дае. Іхную руку трымае адзін толькі Генкін.

І раптам—выпадак: няма чыгуну, завод сунімаецца на два тыдні.

Сімховіч зьбірае партыйную ячэйку. Камуністам і так ужо вядомы стан заводу. Яны геранчна змагаліся за прамфінплян, так як змагаецца пралетар, сьвядома будуючы сваю будучыню. Але іхную волю тармозіць нейкая неарганізованая сыстэма. І гэтую сыстэму трэба заваяваць. Ячэйка знаёміцца з Сімховічавім праектам і вырашае: скарыстаць заводзкі перапынак.

— Важна тое, каб у нас была яснасьць. Гэтую яснасьць мы павінны зрабіць за перапынак у стандартызацыі машын,—згаджаецца старшыня цэхкаму.

— Каб заваяваць перамлом на ўсім заводзе, я думаю—камуністы ганарова возьмуць на сябе гэты абавязак,—кладучы шырокую руку на стол, гаворыць струпаты ад воспы мужчына.

— Ясна. Давайце зробім брыгаду. У добраахвотным парадку. Бальшавікі заўсёды заваёў-

ваюць сілаю. Наша сіла ў прыкладзе па барацьбе за прамфінплян і з апартуністычным самацёкам. Там, дзе пралетарыят будуе сваю дзяржаву, сваю будучыню—яму ня трэба загадаў начальства. У яго ёсьць свая ўнутраная воля і сіла. Гэтая сіла і воля—у заводзкім энтузіязьме...

Камуністы наважылі скарыстаць перапынак. Камсамольцы тасама не захацелі адстаць.

Пад сваю адказнасьць, Белабжэцкі з Сімховічам, у цэсе пакідаюць трыццацёх чалавек рабочых. Разьбіваюць работу: Белабжэцкі на зборцы, на падрыхтоўцы новых дэталяй; Сімховіч ва кантрольных прыладах: зарыхтаваць кандуктары, шаблёны *, каб рабіць масавы выпуск стандартам. Напал разьбіваюць рабочую сілу. Бяруцца за работу. І—зноў ідуць ночы бяз сну, ночы у цэсе, ночы за работаю новых машын. Трэба выкарыстаць перапынак, каб сабраць новую канструкцыю, і—два чалавекі ня могуць пакінуць заводу—астаюцца ў цэсе спаць...

Прылады гатовы. Сабрана тры новых машыны, але Фэльдман ня хоча пускаць. Лепей

---

* Кандуктары, шаблёны—кантрольныя прылады.

старыя. А можа ня ўдасца, і тады яшчэ горшая мука.

Рызыкнулі. З вайною, з грызьнёю, але пусьцілі. На новым патоку Белабжэцкі зноў ня можа выходзіць з цэху. Можа ёсьць памылкі, і іх трэба паправіць на хаду, каб не ўпікалі. Але перамога відаць адразу: паток пачынае даваць па дваццаць машын.

Зборка наладжана. Але зборка залежыць ад усяго заводу. Як пададуць дэталі загатоўчыя цахі? Мэханічны тармозіць сыстэматычна. Мэханічны танцуе як хворая нэрва і патрабуе капітальнае перабудовы. Але зборку зрываюць і такія цэхі, як лёгка-кацельны, ліцейны, кавальскі, і гэтых—трэба узяць у муштру.

Сіласарэзкі сталі. Сіласарэзкі ня могуць зьбірацца. У лёгка-кацельным вялікі прарыў. Няма ні ланцугоў, ні патрубкаў. Ня могуць рабіць.

Не прарыў—Белабжэцкі. Праз месяц—запас. А яшчэ праз месяц зноў няма ні патрубкаў, ні кажухоў. Але Сімховіч ўжо сунімае Белабжэцкага.

— Давай на буксір!

— Давай!

Сімховіч, зноў на чале з камуністамі, зьбірае брыгаду. Брыгада ўрываецца ў лёгка-кацельны. На сьценах павісьлі плякаты-трывогі—прарыў. Беглая вытворчая нарада, і—брыгада чатыры дні буксуе лёгка кацельны. На штурме Белабжэцкі чаргуецца з Сімховічам—трэба-ж быць і на зборцы.

У гэтага чалавека вялікая воля і ўпартасьць, У гэтага чалавека вялікае ўмельства гнутка падаць каманду. Галоўнае—правільна расставіць рабочую сілу. Галоўнае—умеючы яе арганізаваць. Жыць цэхам, заводам—знаць яго пульс, каб манэўраваць, як на фронце.

І ў Белабжэцкага добры таварыш па барацьбе, па штурме, добры кіраўнік-энтузіяст, Сімховіч—перш сакратар парт'ячэйкі, а пасьля яго памочнік, калі ён становіцца на пасаду перш майстра, а пасьля начальніка цэху. І ў Белабжэцкага яшчэ актыў з энтузіястаў-рабочых, на чале з партыйнаю і камсамольскаю часткаю, з яе выхаваўчаю работаю.

Завод—Гомсельмаш—яшчэ малады. Завод перажывае пускавы пэрыяд хварэе на так званыя „дзічачыя хваробы"—на непаладкі, зрывы—пускавую тузаніну, на малады рабочы склад, дзе таксама патрэбна работа.

Прагpама—дваццаць пяць сіласаpэзак на месяц.

І—зноў гугняваць Фалкіны, Фэльдманы, знаходзячы свой адгалосак і ў цэхах. Будзе прарыў. Праграма праваліцца. Дзе гэта—выканаць гэткую норму...

А сельмашаўскія энтузіясты даюць сустрэчную праграму: трыццаць машын. Сьвядомым будаўніком ня трэба загадаў начальства.

Зноў бой за графік, бой за выкананьне праграмы. Але галоўнае—трэба ўмець манэўраваць—падцягнуць адсталыя вучасткі. Зборка залежыць ад загатоўчых цэхаў, а загатоўчыя цэхі пасуюць, трэба зборцы падаць каманду манэўраў.

І тады Белабжэцкі ідзе да начальніка цэху у канторку—сварыцца, што цэх без каманды. Санаторскі ня можа. Санаторскі фізычна ня можа, бо ведаеце-ж самі...

Каманду бярэ Белабжэцкі.

І вось:—

Завод у нэрвах, завод у прарыве—завод у „дзіцячых хваробах". Ліцейны марынуе ліцьцё—ня можа спраўляцца. Кавальльскі зрывае дэталі—не хапае жалеза.

Мэханічны снуецца ў бясьсільлі, у непаладках, у зрывах—сыстэматычна. Графік выкананьня хістаецца. Але-ж трэба заваяваць сустрэчнае?

У Сімховіча заўсёды цяжкія рукі, а цяпер яны адвісаюць, як чужыя. Але пасьля работы Белабжэцкі з Сімховічам доўга астаюцца ў цэсе. Яны нешта талкуюць, плянуюць, вылічваюць, запісваюць у замурзаны блёкнот—складаюць праект каманды.

І каманда такая: брыгады, спаборніцтва, буксір, апэрацыйныя манэўры.

Энтузіястам на штурм зьбірацца нядоўга.

У ліцейным брыгады са зборкі самі выбіраюць апокі, самі робяць абрубку, абчыстку; цягнуць у мэханічны, точаць, сьвідруюць, і— на зборку. Мэханічнаму цэху аддаюць сваіх лепшых работнікаў—толькі дайце дэталі! Кавальскаму брыгады р о б я ц ь жалеза—па двары выбіраюць патрэбнае з браку, валочаць, цягаюць—наце!..

## V

Доўгаю заляю, застыўшым патокам машын адпачывае цэх. Адна за аднэю машыны стаяць

ланцугом і, адтаго, што выпіраюць яны патрубкамі ды адводнымі трубамі—ланцуг здаецца шурпатым. Цэх маўчыць.

На сьцяне—на адмысловай дошчачцы—Белабжэцкі запісвае графік. Ад спэцыяльнае шпулькі ён адрывае нітку вузенькае чырвонае паперынкі і наклейвае. Упоперак графіку ідзе таксама чырвоная, але тоўстая лінія—трыццаць. Белабжэцкі пераводзіць гэтую лінію на адзін квадрацік, і моцна прыціскае пальцам паперынку.

— Ну, вось і добра. Трыццаць адна. Пацягаліся, але ўзялі. Пераваліл і сустрэчнае. А цягацца давялося багата. Чаго каштавала скараціць брыгаду Шырокага. Нават нажы даставалі... А вышла эфэктна: скарацілі брыгаду бадай удвойчы, і ўдвойчы брыгада падвысіла норму. Дагнала да сараку дыскаў. Любата. Толькі наладзіўся-б яшчэ мэханічны...

Белабжэцкі яшчэ раз прыціскае паперынку, уздыхае і шырокаю далоньню пацірае лоб так, што шапка зьяжджае на патыліцу.

— Та-ак,—гаворыць ён сам сабе, відаць, канчаючы нейкую думку і, гладзячы тэю-ж далоньню шчаку, паволі ідзе па цэсе.

VI

А ўсё-такі—якая складаная сыстэма гэты завод. І які дакладны павінен быць мэханізм гэтае сыстэмы. Вось недзе парушылася маленькая калёсінка, і на заводзе зноў прарыў.

У Сімховіча больш апускаецца галава. Яшчэ больш цяжэюць, абвісаюць рукі. Неяк моўчкі, пакрыўджана працуюць брыгады. Генкін праходзіць па цэсе і, чамусьці, няма чаго сказаць яму: ні пахваліцца, ні паскардзіцца. Проста—крыўдна. Так добра падымаўся графік угору, так добра, хораша ішоў паток, а гэта правал. Крыўдна. І чорт яго—як гэта здарылася? Запароць усю дзённую норму рам...

Генкін грузна ідзе па патоку. Паток парваны. Лысеюць пустыя прагаліны, а на першых працэсах нават няма людзей.

— Запароліся, — гаворыць да Сімховіча Генкін.

Сімховіч разводзіць рукамі. Няма чаго гаварыць. Хіба ня відно, што запароліся, селі. Ды яму і цяжка гаварыць, бо ён цэлую ноч ня спаў, і цяпер галава, як цэбар. Шуміць. Усё думалася, што можа што-небудзь можна прыдумаць...

Сімховіч яшчэ раз разводзіць рукамі, цяжка іх апускае і, таксама-ж цяжка, накаса перасякае цэх.

З канторкі мэханічнага відаць Белабжэцкі з начальнікам мэханічнага цэху—з Дрыцам. Дрыц круглы, здаравенны, дробна семяніць нагамі і, што раз авіраючыся, заўзята нешта тлумачыць Белабжэцкаму. На круглым твары яго губы мыляюцца неяк надзвычай скора, і па кутках адкладаецца пенка.

— Я табе пакажу, што бакавін мы не сарвалі. Мы сарвалі рамы, гэта праўда, і за гэта вы нас беце. Але-ж вы не падымайце гармідару там, дзе ня трэба. Вы на нас крычэце, памагайце нам, але-ж рабеце гэта толкам. А то: дзе толькі што чуць заела, дык вінаваты мэханічны. А я табе пакажу, што вы самі зрываеце—вы падымаеце паніку...

У Дрыца ўсё драбней трасуцца губы і па крайкох ўсё больш зьбіраецца пенкі. Белабжэцкаму няма чаго гаварыць—ён сваё ўжо адкрычаў ў канторцы і злосьць асталася толькі ў перагарэўшай нагары ў горле. Ён сьпяшае, каб пасьпець за Дрыцам, але Дрыцаў голас раптам абрываецца і Дрыц сукімаецца каля варштату.

— Ну?—пытаецца Белабжэцкі нагнаўшы.

Дрыц маўчыць. У яго зразу суняліся трэсьціся губы і па крайкох пенка застыла. Ён глядзіць на кучу дэталяй і на круглым твары акругляюцца і вочы.

— Цяпер я нічога не разумею,—гаворыць ён ужо раптам гледзячы на Белабжэцкага.— Ты разумееш?—дэталі здадзены на абробку яшчэ заўчора. Дэталі здадзены на варштат і яны не аброблены. Эх, гэты Мацьвеенка! Гэта вось так ён давёў заданьне да варштату! Ну, ты разумееш?..

— І ў цябе заўсёды так, таварыш Дрыц, і заўсёды ты не вінаваты... Сьвінства,—раптам перабівае Белабжэцкі, паварочваецца і порстка ідзе на зборку.

Сімховіч з Саранчуком гнуцца над кучаю забракованых рам. Хаця-б штук з дзесятак папалася добрых. Хаця-б ня пускаць дахаты людзей.

Але ў Белабжэцкага нарадзілася думка (можа і выгарыць) і ён нахаду ўжо крычыць Сімховічу:

— Давай людзей! Перакідай сюды з гуляшчых брыгад, стаўляй на работу!

Сімховіч глядзіць, ён яшчэ не разумее—яшчэ не пачуў—што гаворыць Белабжэцкі.

— Выберам. Гуртам наляжам—падгонім, пакуль нагатуюць новых. Як-небудзь, хоць трохі, выцегнам.

Накаса прабягае раззлаваны Дрыц. Ён крычыць на Мацьвеенку (на Р. Б.* свайго цэху), і той, ледзь пасьпяваючы за ім, вінавата пярэчыць. Заўсёды бо ён ды ён вінаваты. А вінаваты ня ён, а струментальнік. Паставілі нягегліцу нейкага, практыканта—тармазіў усю зьмену. Варштаты стаяць (дрыляваць-жа пальцам ня будзеш), а ў яго па гадзіне чарга па патроны ў сьвідроўку. А цяпер віна на яго—не давёў да варштату заданьня... Ды наогул—калі мэханічны спраўляўся?..

— Давай, хлопцы, давай! Давай разам наляжам, каб выраўняць. Ану, можа і выцягнем трохі,—коратка, забыўчыва гаворыць Белабжэцкі да штурмавое Сімховічавае брыгады, і сам падымае раму на ход.

Але нешта там сталася ў Каганавай брыгадзе і яму трэба бегчы на другі канец цэху.

... Які вар'яцкі сёньнешні дзень. Недзе ў мэ-

* Р. Б.—разьмеркавальнае бюро.

ханічным парушылася маленькая калёсінка і на зборцы такая высокая тэмпэратура. Спрэс тузаніна. Трэба брыгады зьнімаць з сваіх месцаў. Трэба тасаваць, перакідаць людзей на чужыя працэсы—падганяць, выраўняць, сточваць паток. А паток не даецца. Ен тузаецца парушанаю калёсінкаю, парушаючы ходу ўжо ўсяе сыстэмы, усяго арганізму. І парушаная сыстэма ўжо дае перабой на другіх дэталях, на ўсім патоку.

— А можа выцягнем?—пытаецца Белабжэцкі, гледзячы з-пад ілба з нейкім нядобрым, калючым бляскам.

Лейкін перш доўга не адказвае. Выціраючы бруднаю рукою шчаку і пакідаючы сьлед на ёй, ён нешта прыгадвае. А тады бярэ ў рукі падшыпнік і, падшыпнік калупаючы, гаворыць:

— Яно можа і ўзялі-б, але-ж зборка стала пазьней на работу. Больш гадзіны патрацілі на ўсялякую музыку...

— А што калі-б гэтыя гадзіны нагнаць?

Белабжэцкі перш доўга глядзіць на Лейкіна, на яго шырокі разумны твар, а пасьля вочы забываюцца, ападаюць уніз, а на ілбе вырэзваюцца шырокія складкі ад нахмураных броў.

— Так, так. А што, калі гэтыя гадзіны нагнаць,

а? Тады роўным астанецца графік. Тады ня будзе прарыву ў выкананьні пляну. Будзе хораша закончаны квартал... А што, калі гэтыя гадзіны нагнаць, а?

— А што ты думаеш,—можна!—перарывае Лейкін, з размаху кладучы падшыпнік на раму.—Давай паталкуем з хлопцамі. Гадзінак са дзьве папрацуем ды можа і выцягнем...

* * *

Раскалолася толькі Саранчукова брыгада. Першая брыгада па зборцы сіласарэзак. Напружаны момант. Трэба сёньнешні дзень зрабіць гераічным. Трэба сёньня штурмам ліквідаваць прарыў. І ў брыгадзе раскол. Няўжо пахісьнецца графік?

Гудок на канец рабочага дня. Тры далейшых брыгады не скранаюцца з месца. Людзі рушаць наперад адсталы паток. Выпрабавальнай станцыі трэба даць яшчэ восем машын. Трэба выцягнуць...

Саранчук насарожваецца. Гудок, і ён знае: яго брыгада можа сарваць. Ён ведае, што ў яго брыгадзе багата прагульнікаў і сымулянтаў і з імі ваяваць будзе цяжка.

Вось Калацкі ўжо падымае рыжую галаву.

— Дык што гэта—зноў штурмаваць?

— А ты што, запарыўся?

Калацкі не адказвае, а паволі выцірае рагожынаю рукі і спакойна канчае сваю думку:

— Даво-олі. Я свае сем адпрацаваў і магу пайсьці.

— Але. Лепш будзе, калі ты пойдзеш, смалі!—так-жа сама спакойна заўважае кругдявы рабочы, бяручы на шаброўку новую раму.

Калацкі ўжо каля шафкі складае струмант і быдта ня чуе. Фон-Левін палажыў струмант дачасу на раме. Ен мяркуе—як яму быць: пайсьці ці астацца?—і, каб не паказаць, што ён гэтым заняты—папраўляе папружку.

— А ты-ж куды, Гусараў?

Гусараў як-бы пужаецца, сьцепаецца, але, забіраючы шабру, пробуе ўсьміхнуцца і гаворыць, робячы голас спакойным.

— Я? Да хаты... Была-ж сырэна...—і праз гэтую насьмешку прарываецца злосьць.

Фон-Левін пытаньне таксама ўжо вырашыў—рама яго пустая. Нехта ўкрадкі—баючыся нават свайго права—зьбіраецца пакінуць работу ящчэ.

— Ы-ы, сволачы. І яны будуць гаварыць, што ім дораг завод.

— Ім даражэй лыжка капусты.

Гусараў выцірае рагожынаю рукі, і ў рагожыне пальцы трасуцца. Ён зразу пасьля гудка пачуў·быў, як ўнутры ў яго тарганулася нейкая нэрва. Ён ня ведаў тады яшчэ: астанецца ці не, і ўнутры ваявалі тады яшчэ два чалавекі.

Таргануліся ў рагожыне пальцы.

Нехта сказаў пра капусту і пра завод. Гэта што ён хацеў быў сказаць пра капусту? І чаго гэта на іхную брыгаду глядзіць увесь цэх? Што ён ня хоча астацца?

— Так, мне дорага лыжка капусты, бо я адпрацаваў свае сем гадзін і цяпер хачу гэтую лыжку зьесьці. Ты мяне сарамаці ў рабоце. Ты з мяне патрабуй тады, а цяпер мне на ўсё напляваць!

— Верна!

— Ну і плюй, толькі выходзь, не замінай у цэсе.

Саранчук трывожыцца, бо завязваецца сварка. Вось яшчэ каля шафкі варочаецца і Калацкі і Фон-Левін і, едка ўсміхаючыся, яны таксама

ўкідаюць па слову. Рабочыя ў спрэчках і—што калі возьме сарвецца сіла...

— Хлопцы! Ніхто нікога ня прымушае аставацца. Калі хочаш памажы, калі хочаш— ідзі і не перашкаджай другім. Давайце, хто хоча, ня будзем марудзіць. Уся зборка чакае, давайце.

— Адчальвай на лёгкім кацеры...—злосна выпростваецца над рамаю той-жа самы круглявы шаброўнік,—чаго яшчэ гугніш?

У Гусарава накіпае злосьць, што яго—за яго-ж права—абсьмейваюць, бэсьцяць. Адным махам рагожына ляціць у куток і Гусараў порстка скідае рабочы гарнітур.

— І пайду, і ты мне нічога ня зробіш, бо я сваё аддзяжурыў. Ну, хто хоча—хадзем... Я свой сацыялізм яшчэ пабудую,—гаворыць ён ужо з цэхавых варот наганяючы сваіх прыяцеляў.

...Вышаўшы з заводу, Гусараў зьменшвае крок. Зноў пачынае торгацца ўнутры нейкая нэрва. Ня добра зрабіў. Не астаўся, ды яшчэ і накрычаў. І хіба добра, што на яго глядзела ўся зборка, глядзела з пагардаю—баіцца перадаць сваіх дзьве гадзіне... Зрабіў ня добра...

Гусараў сунімаецца і доўга пальцы перабіраюць нешта ў кішэні. Скрынка запалак. Скрынка сьціскаецца пальцамі, патрэсквае, перакошваецца. Вось яна ўжо гатова зламацца, але пальцы слабнуць, пускаюць назад... „Ч-чорт—пагарачыўся!..“ І раптам: пальцы ўядаюцца, скрынка ломіцца з хробустам і Гусараў рыўком варочаецца. На прасьцяк цераз двор ён крочыць назад у цэх...

У цэсе машынамі сточваецца парваны паток. Малаткамі, напільнікамі цэх гудзе гулам работы. Недзе каля выпрабавальнае станцыі шкураною шапкаю маячыць Белабжэцкі. Да Саранчука падыходзіць Сімховіч і таму, што Саранчук рукавом выцірае—запараны лоб—Сімховіч усьміхаецца белымі рэдкімі зубамі і гаворыць:

— А ўсё-такі—выцягнем!

## VII

Яго можна ўявіць або ў рабочым зашмальцованым гарнітуры, або ў шкураной тужурцы—але заўсёды гэта будзе высокі, танклявы чалавек, з энэргічным тварам, з цьвёрдымі вачыма, і ён заўсёды будзе на заводзе, у цэсе.

Рабочы дзень зборачнікаў даўно ўжо кончыўся, даўно адпачывае зборачны цэх, але ён ня можа не астацца на заводзе. Ён павінен вымацаць заўтрашні дзень і заўтрашні-ж дзень нарадзіць ужо сёньня падрыхтоўкаю дэталяй, вывучэньнем слабых вучасткаў, расстаноўкаю рабочае сілы—у пляне, у праекце—на заўтра.

На зборцы ноч, і цэх адпачывае застыўшым патокам. Белабжэцкі шкураною шапкаю маячыць у мэханічным. У электрычнасьці шапка адблісквае, нагінаецца каля варштату. У руках у Белабжэцкага штангель—ён правярае дэталь. Каб толькі не запаролі. Каб заўтра не заелі патоку. Трэба самому праверыць якасьць дэталяй, пагаварыць з майстрам, параіцца—каб ведаць, каб вывучыць заўтрашні дзень.

Недзе ў канторцы зборачнага сядзіць яшчэ Сімховіч. Ён таксама мацае заўтрашні дзень вылічэньнямі, плянамі, лічбамі дэталяй на вузлох, на працэсах. Белабжэцкі ўспамінае нешта і ідзе па змрочнай велічы гуляшчага цэху.

У Сімховіча, як і скрозь, цяжкая галава. Яна нізка апускаецца над сталом і відаць, што нечым занята. Сімховічавы пальцы за-

няты графікам. Яны вельмі таропкія гэтыя Сімховічавы пальцы. Вось прыклалі чырвоную папяровую палоску, давялі да трыццацёх пяцёх і абарвалі палоску. Гэт, немач, а трэба-ж давесьці як сьлед! Сімховіч адрывае другую палоску, ужо ўважлівей праціскае пальцамі і даводзіць да трыццацёх васьмёх. Трыццаць восем сіласарэзак. Во—гэта графік. Такі і наклейваць будзеш з ахвотаю... На гэтулькі перабраць сустрэчнае. А яшчэ-ж як...

Але мары перабівае Белабжэцкі.

— Ну, думаў?

Сімховіч падымае цяжкую галаву і ў вачох яго зьліплая ўтома.

— Думаў, але-ж гэта сур'ёзная рэч, і яе трэба не надумаць, а распрацаваць.

У Белабжэцкага таксама рэжуцца вочы. Ен тры ночы ня спаў. Вагоны, хаданіна, вагоны... Быў на экскурсіі на украінскіх заводах. Прэміяльная экскурсія. З дарогі прывёз новую думку і ёю падзяліўся з Сімховічам. Думка сур'ёзная. Але, гэта дасьць новую форму работы, адказьнейшыя адносіны да яе. Ён цяпер начальнік зборачнага цэху, і гэта на яго ўскладае яшчэ большую пільнасьць.

— Давай, памазгуем. Ты сур'ёзна вазьміся.

Распрацуем праект і—да Камаева. Гэта ня Фалкіну цёзка—раскусіць. А тады зразу за работу і за месяц каб быў гатовым. Праўда?.. Ну, а цяпер—дахаты.

Белабжэцкі падымаецца з крэсла і, кладучы па канторцы цень, фігура яго робіцца яшчэ больш доўгаю. На зmораным твары павекі ападаюць нізка і відно, што гаркатою рэжуцца вочы.

... Ноч падыхае невялікім сьвежым ветрам. Пад нагамі храбушча жвір. Недзе на чугунцы перагрукваюцца буфэры і далёка з гораду чуцён апошні працяжны голас аўтобусу.

— Гэта абавязкова трэба зрабіць,—думае Белабжэцкі, перасыпаючы думкі хробустам жвіру.—Да гэтага даўно ўжо завод падышоў і гэта патрабуе штодзённы наш рост. Будзе цяжкавата. Трэба вылічыць. Трэба надзвычайна дакладна вылічыць, колькі часу зойме кожны працэс, кожны вузел, кожная дэталь. Гэта самы асноўны прынцып. А адсюль—трэба будзе пановаму расстаўляць і рабочую сілу. Гэта трэба страшэнна вялікая дакладнасьць. Каб нідзе ні на адну хвіліну ня было замятку, а так, як мэханізм у гадзіньніку. Прышла пара: паток і парушыўся на вядомую

меру мэтраў і часу. Та-ак... І бадай давядзецца рабіць на крукох. Крукамі адна за адну, адна за адну—цэлым патокам—а наперадзе рухавік: хай цягне.

— А вось з рухавіком гэтым, чорт яго, трэба падумаць. Трэба падумаць, каб ён рушыў паток праз вядомы час, вядомую сілаю, на вядомую меру. Вось гэта і... трэба сур'ёзна падумаць над гэтым.

Белабжэцкі ўжо праходзіць Палескую, мінае апошнія электрычныя агні, каб павярнуць на сваю ціхую з мяккаю муравою вуліцу, як на плячо лажыцца нечая рука.

— Юрка!

Белабжэцкаму зразу пазнаць не дае перарваная думка. Ён паволі падае руку і толькі пасьля ўжо гэтую руку моцна сьціскае.

— Здароў! Во, дзівак, ледзь пазнаў. Ну, куды-ж ты?

„Дзівак"—стары прыяцель Белабжэцкага з часоў хлебаразьвёрстак—токар з заводу Ланцуцкага. Ён распытваецца ў Белабжэцкага пра экскурсію, пра Украіну, пра завод імя Шэўчанкі, пра камбайны, пра вопыт. І ня ўсьпеў яшчэ Белабжэцкі пачаць, падзяліцца, як „дзівак" перабівае яго раптоўным крыкам:

— Стой! Я і забыўся—дай руку!

Белабжэцкі няўцямна глядзіць. У яго нават абрываецца крок..

— Чаго ты?

— Віншаваць хачу! Ты што-ж, і не хвалішся?... А—позна надумаўся...

Белабжэцкі апускае галаву, і здаецца ён слухае хаду сваіх крокаў. Агні Палескае асталіся далёка і „дзіваку" ня відаць, што пад нагнутым казырком загараюцца іскры чалавечае цёплае радасьці. Пад казырком-жа лажыцца і ўсьмешка, такая, якою сустракаюць цёплую радасьць, ня хочучы паказаць яе.

— Ня мог я. Усё думаў, што яшчэ... ну, як тут... не гатоў, ня вышабраваны... А цяпер...

Белабжэцкі гаворыць пра тое, як доўга ён ішоў да сябе бальшавіка, і як гэта цяпер для яго арганічна. Можа гэта дарога пачалася з 401 вярсты, але яна ішла складаным працэсам чалавечага росту, у змаганьні, у штурме заводам прарываў, у цэсе фармоўкі людзей-бальшавікоў.

— А думаў я доўга, гэта ты праўду сказаў... Шабраваўся...

„Дзівак" разьвітваецца, прападае ў завулку-

і, залізваючы яго цень, зразу тужэе ноч. Вуліца дрэмле вішняком на платох, выдыхаючы ў ноч лёгкі сагрэты пах зеляніны.

— Аксеня ўжо мабыць сьпіць?—думае Белабжэцкі, чамусьці настаўляючы каўнер тужуркі. Але раптам думка губляецца і ён напружана шукае ўжо нечага ў памяці.

...На крукох, але... Адна за адну, адна за адну і цэлы рушлівы паток. Канвээр. Гэта трэба як мага хутчэй рабіць. Так як на Шэўчанкаўскім заводзе... Праз месяц павінен пайсьці канвээр... Трэба дакладна вылічыць... Колькі часу зойме кожны працэс, кожны вузел, кожная дэталь і так расставіць рабочую сілу, каб на мэханізованым патоку ня было ніякага замятку, матэматычна дакладна, як гадзіньнік: прышла пара і паток парушыўся на вядомую меру... Канвээр прывучыць да дысцыпліны, прывучыць да парадку, ускладзе на кожнага адказнасьць—сам дыктавацьме тэмпы... дыктавацьме тэмпы...

У напружаным уяўленьні Белабжэцкаму здаецца, што ў цэсе ўжо сапраўды працуе канвээр, і ён павялічвае толькі што затоены мысьлямі крок.

Кастрычнік 1931 г.
г. Менск

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК
СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

| | |
|---|---|
| ВЕРШЫ І ПОЭМЫ | А. АЛЕКСАНДРОВІЧ |
| Стар. 284 | Цана 3 руб. 50 кап. |
| УДАРНІКІ | МенАПП |
| Стар. 130 | Цана 75 кап. |
| ЧОРНАЯ ВІРНЯ | Б. МІКУЛІЧ |
| Стар. 128 | Цана 90 кап. |
| АСІНСТАН | І. БАРАШКА |
| Стар. 24 | Цана 45 кап. |
| БАЯВЫ САВЕТ | В. ГАЛІНА |
| Стар. 40 | Цана 40 кап. |
| РАСІЯ | АНРЫ БАРБЮС |
| Стар. 212 | Цана 75 кап. |

КНІЖКІ ПРАДАЮЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ ДВБ, СПАЖЫЎКООПЭРАЦЫІ І САЮЗДРУКУ

1964
Бел. аддзел
1994 г.



B0000000308 1624

ЦАНА 40 кап.